**III Рэспубліканскі тэатральны фестываль "Перамога"**
адбудзецца ў Мінску з 12 па 29 мая 2025 года

У год 80-й гадавіны Перамогі савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне з гонарам і пашанай да подзвігу беларускага народа **з 12 па 29 мая ў Мінску будзе праходзіць III Рэспубліканскі тэатральны фестываль "Перамога"**, які аб'яднае тэатральныя калектывы з усёй краіны і з дапамогай найлепшых мастацкіх сродкаў нагадае пра тое, якой дарагой цаной – цаной тысяч жыццяў – было здабыта мірнае неба над Беларуссю. У конкурсных праграмах фестывалю прымаюць удзел 11 спектакляў з *Брэста, Віцебска, Гомеля, Гродна, Мінска, Маладзечна.*

Галоўныя мэты фестывалю – папулярызацыя тэатральнага мастацтва і спектакляў патрыятычнай тэматыкі, развіццё і ўмацаванне лепшых традыцый, дасягненняў нацыянальнай тэатральнай школы, умацаванне культурных сувязяў, абмен духоўным і культурным творчым вопытам, павышэнне прафесійнага майстэрства ўдзельнікаў фестывалю і іх цікавасці да спектакляў ваенна-патрыятычнай тэматыкі, выяўленне і падтрымка таленавітай моладзі, павышэнне ўзроўню выканальніцкага майстэрства, арганізацыя патрыятычнага выхавання грамадзян.

Падчас правядзення фестывалю гледачы ўбачаць самыя глыбокія, кранальныя і відовішчныя пастаноўкі ваенна-патрыятычнай тэматыкі бягучага тэатральнага сезона і сезонаў, якія мінулі, убачаць шэраг лёсаў і жыццёвых выбараў.

Таксама варта адзначыць, што ўпершыню ў фестывалі прымаюць удзел госці – тры спектаклі бяруць удзел у фестывалі па-за конкурсам.

Спецыяльна ў Рэспубліку Беларусь для ўдзелу ў гэтым знакавым фестывалі прыязджае найстарэйшы нацыянальны тэатр Расіі ФДБУК "Нацыянальны драматычны тэатр Расіі (Александрынскі тэатр)" з *Санкт-Пецярбургу* з дакументальным монаспектаклем "Блакадны дзённік Александрынкі".

Пераважна пастаноўкі – а ўсяго іх 15 – будуць праходзіць на сцэнічных пляцоўках Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, сталічныя тэатры пакажуць свае спектаклі на ўласных сцэнах. Таксама ў праграме фестывалю "Перамога" вы знойдзеце цікавыя майстар-класы для акцёраў, сцэнографаў, мастакоў і іншых творчых людзей, лекцыі, круглы стол тэатральных дзеячаў. Упершыню гледачы змогуць убачыць спектакля "А зоры тут ціхія" на кітайскай мове.

Яшчэ адным яркім новаўвядзеннем стане магчымасць для ўдзельнікаў фестывалю пазмагацца за прызавыя месцы ў конкурсных праграмах "Спектакль тэатра драмы" і "Спектакль тэатра лялек" у намінацыях "Лепшы

спектакль", "Лепшая мужчынская роля", "Лепшая жаночая роля", "Лепшая рэжысура", "Лепшая сцэнаграфія".

Рэспубліканскі тэатральны фестываль "Перамога" з першага года правядзення з'яўляецца сапраўднай падзеяй у культурным жыцці краіны, і мы перакананы, што і ў 2025 годзе маштабная праграма фестывалю і абраныя для ўдзелу спектаклі не пакінуць нікога абыякавымі. Фестываль падкрэсліць дасягненні сучаснага тэатральнага мастацтва, дасць магчымасць убачыць лепшыя пастаноўкі сталічных і рэгіянальных тэатраў і яшчэ раз зверне ўвагу на неабходнасць захавання гістарычнай памяці і пашаны да гераізму нашага народа.

**Будзем ганарыцца. Будзем памятаць. Будзем разам!**

**Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы**
**Кантакт для сувязі: +375 (17) 357-99-07**
**+375 (33) 320-02-74 - Дар'я Талалаева**

# „ПЕРАМОГА"

**РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТРАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ**

## МАЙ 2025

**12** ПАНЯДЗЕЛАК 19:00

АДКРЫЦЦЁ ФЕСТЫВАЛЮ
Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа
У.Туркін
### САНЯ, ВАНЯ, З ІМІ РЫМАС (16+)
Жыццёвая меладрама на 2-е дзеі
1 гадзіна 40 хвілін з антрактам
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Галоўная сцэна)

**13** АЎТОРАК 14:00

Тэатр-студыя кінаакцёра УП „Нацыянальная кінастудыя „Беларусьфільм"
А.Дудараў
### РАДАВЫЯ (12+)
Гістарычная драма ў дзвюх дзеях
2 гадзіны з антрактам
Месца правядзення: Тэатр-студыя кінаакцёра УП „Нацыянальная кінастудыя „Беларусьфільм"

**13** АЎТОРАК 19:00

Гомельскі гарадскі маладзёжны тэатр
Паводле апавядання К.Булычова „Можна папрасіць Ніну?"
### ПА-ЗА ЧАСАМ (12+)
Фантастыка ў ніці лёсаў
1 гадзіна 10 хвілін без антракту
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Галоўная сцэна)

**14** СЕРАДА 19:00

Брэсцкі акадэмічны тэатр драмы імя Ленінскага камсамола Беларусі
А.Макаёнак
### ТРЫБУНАЛ (12+)
Трагікамедыя
1 гадзіна 30 хвілін без антракту
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Галоўная сцэна)

**15** ЧАЦВЕР 19:00

Гродзенскі абласны драматычны тэатр
А.Дудараў
### НЕ ПАКІДАЙ МЯНЕ (12+)
Балада
1 гадзіна 20 хвілін без антракту
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Галоўная сцэна)

**17** СУБОТА 13:00

Мінскі абласны тэатр лялек „Батлейка"
Г.Лякомцава, І.Сасноўская
### ПОМНЯЧЫ ГЕРОЯЎ ПЕРАМОГІ (12+)
Музычна-патрыятычная кампазіцыя
40 хвілін без антракту
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Камерная сцэна)

**19** ПАНЯДЗЕЛАК 15:00

### МАЙСТАР-КЛАС
ТВОРЧАЯ СУСТРЭЧА: „НАЦЫЯНАЛЬНЫ – ПУШКІНСКІ – АЛЕКСАНДРЫНСКІ ТЭАТР. СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ" (12+)
([illegible])
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Камінная зала)
Уваход па папярэдніх заяўках

**19** ПАНЯДЗЕЛАК 19:00

Маладзёжны тэатр эстрады
У.Арцюкоўская
### БЕЗ ТЭРМІНА ДАЎНАСЦІ (12+)
Гістарычная меладрама
1 гадзіна 30 хвілін без антракту
Месца правядзення: Маладзёжны тэатр эстрады

**20** АЎТОРАК 15:00

Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі
Па матывах аповесці А.Кобец-Філімонавай „Жаваранкі над Хатынню"
### ХАТЫНЯ (12+)
Прачуванне трагедыі
1 гадзіна 20 хвілін без антракту
Месца правядзення: Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі

**20** АЎТОРАК 17:00

Гродзенскі абласны тэатр лялек
Я.Колас
### СЫМОН-МУЗЫКА (12+)
Драма
50 хвілін без антракту
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Камерная сцэна)

**20** АЎТОРАК 19:00

Госці фестывалю
Нацыянальны драматычны тэатр Расіі (Александрынскі тэатр)
Монаспектакль заслужанага артыста Расіі С.Сытніка
### БЛАКАДНЫ ДЗЁННІК АЛЕКСАНДРЫНКІ (16+)
Дакументальны монаспектакль
1 гадзіна 10 хвілін без антракту
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Камінная зала)

**21** СЕРАДА 19:00

Мінскі абласны драматычны тэатр
В.Ткачоў
### СЕМ ТРАФЕЯЎ РАДАВОГА ШАПКІНА (16+)
Звычайная гісторыя
1 гадзіна 50 хвілін з антрактам
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Галоўная сцэна)

**22** ЧАЦВЕР 19:00

Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы
Па матывах аднайменнай аповесці Б.Васільева
### А ЗОРЫ ТУТ ЦІХІЯ (12+)
Драма
3 гадзіны 20 хвілін з антрактам
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Галоўная сцэна)

**23** ПЯТНІЦА 15:00

### МАЙСТАР-КЛАС
ЖЫВОЕ МАСТАЦТВА: ТЭХНІКА ПРАЦЫ З ЛЯЛЬКАЙ І ГЛЕДАЧОМ (12+)
Месца правядзення: Беларускі дзяржаўны тэатр лялек
Уваход па папярэдніх заяўках

**23** ПЯТНІЦА 19:00

Госці фестывалю
Навучальны тэатр-студыя імя Е.Чэнчжуна
Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў
Па матывах аднайменнай аповесці Б.Васільева
### А ЗОРЫ ТУТ ЦІХІЯ (12+)
Драма
1 гадзіна 30 хвілін без антракту
Спектакль ідзе на кітайскай мове
Месца правядзення: Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў

**24** СУБОТА 19:00

Госці фестывалю
Народны маладзёжны тэатр „Зітуры"
Палаца культуры ТАА „БЕЛАЗ"
Паводле трылогіі І.Мележа „Палеская хроніка"
### ВАСІЛЬ І ГАННА (16+)
Меладрама
1 гадзіна 55 хвілін з антрактам
Месца правядзення: Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў

**26** ПАНЯДЗЕЛАК 15:00

### МАЙСТАР-КЛАС
ГОЛАС, ЦЕЛА, ЭМОЦЫІ: АКЦЁРСКАЯ ТЭХНІКА (12+)
([illegible])
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Камерная сцэна)
Уваход па папярэдніх заяўках

**27** АЎТОРАК 15:00

### МАЙСТАР-КЛАС
СЦЭНАГРАФІЯ ЯК ФЕНОМЕН СУЧАСНАГА ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА (12+)
([illegible])
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Камінная зала)
Уваход па папярэдніх заяўках

**28** СЕРАДА 15:00

### КРУГЛЫ СТОЛ
„ПЕРАМОГА": ВЫНІКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ТЭАТРАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ (12+)
Месца правядзення: Рэдакцыя „Культура і мастацтва"

**29** ЧАЦВЕР 19:00

ЗАКРЫЦЦЁ ФЕСТЫВАЛЮ
Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы
К.Крапіва
### БРАМА НЕЎМІРУЧАСЦІ (12+)
Трагікамедыя ў адной дзеі
Месца правядзення: Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Галоўная сцэна)

Замоўце квіткоў
+375 17 367-17-17
Каса тэатра працуе:
панядзелак – субота: з 10:00 да 19:00;
нядзеля: з 13:00 да 19:00

квіткі на сайце
kupalauski.by

SB.BY
МН
[illegible] КУЛЬТУРА
БЮРО ДРУКУ